Спробы беларускіх калабарацыяністаў рашыць нацыянальныя задачы з дапамогаю акупантаў, роўна як і адыграць колькі-небудзь самастойную ролю, аказаліся марнымі. Лёс Беларусі вызначаўся вынікам барацьбы Савецкага Саюза і нацысцкай Германіі без удзелу якога-небудзь трэцяга боку.

[1] Менская газэта. 1941. 28 чэрвеня.
[2] НА РБ. Ф.4, воп.33а, спр.203, арк.8–10.
[3] НА РБ. Ф.908, воп.1, спр.4, арк.76.
[4] Беларуская газэта. 1942. 1 жніўня.
[5] НА РБ. Ф.384, воп.1, спр.49, арк.1,10.
[6] Литвин А. Белорусская Краевая Оборона // Неман. 1994, №4, С.180.
[7] НА РБ. Ф.4, воп.33а, спр.203, арк.7.
[8] Литвин А. Белорусская Краевая Оборона // Неман. 1994, №4, С.180.

*Н.А.ГЛУШАКОВА*

## КАНЦЭПЦЫЯ ЭКАНАМІЧНАГА АДРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСІ ВА ЎЯЎЛЕННІ БЕЛАРУСКАЙ ПАРТЫІ САЦЫЯЛІСТАЎ-РЭВАЛЮЦЫЯНЕРАЎ (1918–1924)

Вясной 1918 г., пасля абвяшчэння БНР, беларускі нацыянальна-вызваленчы рух уступае ў якасна новую стадыю свайго развіцця. Ідэя нацыянальнага адраджэння Беларусі пераносіцца са сферы абстрактных разважанняў у вобласць практычнай рэалізацыі і накіроўваецца на вырашэнне жыццёва важных праблем эканамічнага і нацыянальна-палітычнага характару. Ідзе пакутлівы пошук беларускага шляху.

У гэты складаны час партыя беларускіх эсэраў[1] прапанавала ўласную праграму нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі. Залогам яе поспеху сябры БПС-Р лічылі вырашэнне пытання аб эканамічных асновах развіцця краю. Увогуле, яны адзначалі, што «ахілесавай пятой» беларускага грамадскага руху з'яўляецца адсутнасць абгрунтаванай канцэпцыі эканамічнага адраджэння. Не мелі яе ў той час таксама і самі беларускія сацыялісты-рэвалюцыянеры. Яны пакуль толькі абазначалі асноўныя арыенціры будучага эканамічнага ладу Беларусі.

Улічваючы спецыфіку сацыяльна-эканамічнага развіцця краю і сацыяльнага складу насельніцтва (аграрны край са слаба развітой прамысловасцю), беларускія эсэры вялікую ўвагу надавалі выпрацоўцы перш за ўсё канкрэтнай праграмы рашэння на Беларусі зямельнага пытання. Пры гэтым яны зыходзілі з аграрнай праграмы БСГ і ў асноўным яе паўтарылі.

Аднак нельга сказаць, што гэта было механічнае капіраванне праграмных патрабаванняў свайго палітычнага папярэдніка. Крытычна іх перагледзеўшы, сябры БПС-Р прыйшлі да высновы аб неабходнасці істотнай дапрацоўкі. Так, грамадоўцы прапаноўвалі, каб уся зямля, акрамя лясоў, выганаў і вадзяных абшараў, якія абвяшчаліся агульнакраёвай уласнасцю, перадавалася без выкупу ў карыстанне сялянства. Пасля смерці гаспадара, або з прычыны непрацаздольнасці, атрыманы надзел зямлі пераходзіў у карыстанне бліжэйшых яго супрацоўнікаў. Велічыню надзелу вызначала мясцовая дзяржаўная арганізацыя.

Такая фармулёўка беларускім эсэрам падалася не зусім дакладнай. Патрабавалі далейшага высвятлення, па іх меркаванні, два палажэнні. «Па-першае, якой нормай павінна кіравацца пры ўстанаўленні велічыні надзелу гэтая мясцовая дзяржаўная арганізацыя і, па-другое, якім спосабам індывідуальна-падворная сялянская гаспадарка можа ператварыцца ў калектыўную»[2].

Зыходзячы з гэтага, а таксама ўлічваючы сялянскія наказы, БПС-Р у сваім першым праграмным дакуменце – брашуры «Чаго дамагаецца Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў», выдадзенай у чэрвені 1918 г., прапанавала наступны парадак вырашэння зямельнага пытання.

Прыватная ўласнасць на зямлю адмяняецца. Яна лічыцца агульнанародным скарбам. Ніхто не мае права зямлю прадаваць, купляць і дарыць. Усе будынкі, жывы і мёртвы інвентар застаюцца ва ўласнасці сялян.

Памешчыцкія, манастырскія, удзельныя і іншыя землі канфіскуюцца. З іх ствараецца нацыянальны зямельны фонд, падпарадкаваны Цэнтральнаму Усебеларускаму зямельнаму камітэту, які праз свае губернскія, павятовыя і валасныя зямельныя арганізацыі ажыццяўляе надзяленне зямлёй усіх, хто пажадае яе апрацоўваць уласнымі сіламі. Форма карыстання зямлёй устанаўліваецца самім мясцовым насельніцтвам.

Разам з тым эсэры лічылі неабходным устанавіць нормы карыстання зямлёй – «не ніжэй спажывецкай і не вышэй працоўнай», г.зн., што «кожны грамадзянін мае права браць зямлі не больш, чым можа абрабіць адзін, ці у таварыстве, але не менш неабходнага, каб чалавек з сям'ёй мог пракарміцца»[3].

Зямельныя нетры, лясы, рэкі і азёры абвяшчаюцца дзяржаўнай уласнасцю і пераходзяць у распараджэнне цэнтральнай улады Беларусі. Дзяржава павінна клапаціцца аб усіх, хто атрымаў зямлю, аказваючы ім дапамогу шляхам выдачы інвентару, сямян, матэрыялаў для будоўлі, правядзення меліярацыі пустак, балот і інш.

Такім чынам, асноўным шляхам вырашэння аграрнага пытання на Беларусі белэсэры лічылі сацыялізацыю зямлі.

Патрабаванні БПС-Р у галіне рабочага заканадаўства мелі самы агульны характар, а менавіта: усталяванне 8-гадзіннага працоўнага дня, паляпшэнне абставін працы і г.д.

Палітычныя абставіны для рэалізацыі выказаных патрабаванняў былі надзвычай неспрыяльнымі. У ходзе першай сусветнай вайны тэрыторыя Беларусі была падзелена войскамі Германіі і Расіі на дзве часткі. Вясной 1918 г. пад нямецкай акупацыяй аказаліся заходнія і цэнтральныя раёны рэспублікі. Зразумела, што ў такіх умовах немагчыма было весці гутарку аб эканамічных рэформах.

Савецкая ўлада існавала толькі ва ўсходніх паветах Віцебскай і Магілёўскай губерняў, але і тут сітуацыя была досыць складанай. У той час у кіраўніцтве РКП(б) усё больш замацоўваецца левакамуністычная мадэль сацыялізму, якая паступова трансфармуецца ў палітыку «ваеннага камунізму». Галоўнымі задачамі гэтай палітыкі былі: правядзенне харчовай развёрсткі, манаполія хлебнага гандлю, нацыяналізацыя ўсёй прамысловасці, жорсткае размеркаванне харчовых і прамысловых рэсурсаў, усеагульная працоўная павіннасць. Прадпрымалася спроба ўстанавіць прамы прадуктаабмен паміж горадам і вёскай.

У снежні 1918 г., пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў, амаль на ўсёй тэрыторыі края разам з усталяваннем савецкай улады замацоўваецца і «ваены камунізм».

БПС-Р не магла пагадзіцца з такой палітыкай надзвычайных мер, асабліва ў адносінах да сялянства. У сувязі з гэтым беларускія эсэры выступілі супраць увядзення харчразвёрсткі і камбедаў. Яны патрабавалі ліквідацыі ўсіх «незлічоных рэквізіцый і набораў», неадкладнага вырашэння зямельнай справы шляхам сацыялізацыі[4].

Пад канец снежня 1918 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб тэрміновым утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі ўрад, на чале з З.Жылуновічам, сваім Маніфестам ад 1 студзеня 1919 г. абвясціў Беларусь «вольнай і незалежнай». Аднак праіснавала яна нядоўга. Ужо ў сярэдзіне студзеня 1919 г. Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні былі далучаны да РСФСР, а 27 лютага на аснове Гродзенскай, Мінскай, Віленскай і Ковенскай губерняў абвясцілі Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку.

Такі падыход да вырашэння праблемы беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці толькі ўзмацніў антыбальшавісцкія настроі у БПС-Р. Супрацьстаянне прывяло да таго, што белэсэры на савецкай тэрыторыі былі вымушаны перайсці на нелегальнае становішча.

Вясной – летам 1919 г. у выніку наступу польскіх войск былі акупаваны цэнтральныя і заходнія раёны Беларусі. У гэтых умовах БПС-Р ідзе на часовае замірэнне са сваімі палітычнымі апанентамі – партыяй бальшавікоў.

У снежні 1919 г. у Смаленску адбылася сустрэча прадстаўнікоў БПС-Р і КП(б)ЛіБ, дзе было выпрацавана пагадненне аб сумесных дзеяннях. Пайшоўшы на яго, сябры партыі, аднак, не адмовіліся ад сваіх папярэдніх патрабаванняў, у тым ліку і эканамічных.

4 сакавіка 1920 г. у Мінску адбыўся надзвычайны з'езд партыі, на якім была прынята новая праграма. Значнае месца ў ёй займала распрацоўка асноў гаспадарчага ладу Беларусі.

У дачыненні да зямельнай справы БПС-Р прытрымлівалася сваіх ранейшых патрабаванняў. Уся зямля, што выкарыстоўваецца пры вядзенні сельскай гаспадаркі, сацыялізуецца, а азёры, рэкі, лясы, балоты, а таксама зямельныя нетры нацыяналізуюцца. Пры гэтым партыя выступіла за стварэнне шырокіх магчымасцей у арганізацыі калектыўнага карыстання зямлёй.[5]

У далейшым белэсэры канкрэтызавалі гэтыя патрабаванні і палічылі неабходным аставіць у падпарадкаванні Працоўнай Рады частку былых памешчыцкіх, манастырскіх, удзельных і іншых зямель з мэтай арганізацыі паказальных «вытворчых народных маёнткаў». Але іх доля не павінна была перавышаць 25 % зямлі, што ўжывалася ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Пераход ад індывідуальнай формы гаспадарання да калектыўнай прызнаваўся магчымым толькі на аснове вольнага кааперыравання.

Прапануючы сваю аграрную праграму, беларускія эсэры улічвалі спецыфіку гістарычных форм землекарыстання на Беларусі, а менавіта значна меншае распаўсюджванне, у параўнанні з цэнтральнымі расійскімі губернямі, сялянскіх абшчын. Таму, па іх меркаванні, раптоўны пераход да калектыўнай апрацоўкі зямлі быў бы шкодным для справы, так як «сялянства нашае, жывучы праз увесь час сваёй асобнай гаспадаркай, будзе незадаволена гэтай рэформай і можа пайсці супраць улады у той час, калі ідзе змаганне на фронце»[6].

Адзначым, што партыя адстойвала ідэю шырокага развіцця кааперацыі, вытворчай і спажывецкай, сялянскай і рабочай, разглядваючы яе як альтэрнатыву прыватнай прамысловасці і гандлю. У якасці выключэння белэсэры дапускалі магчымасць часовай нацыяналізацыі буйнай прамысловасці ў пераходны момант, з удзелам у кіраванні вытворчымі аб'яднаннямі. Уся ж астатняя прамысловасць і гандаль павінны былі кааперыравацца. Прыватныя банкі прапанавалася нацыяналізаваць і ўтварыць адзіны народны банк.

БПС-Р прапанавала стварыць адзінае цэнтральнае спажывецкае і вытворчае аб'яднанне (Раду Народнай Гаспадаркі) з прадстаўнікоў кааперацыі, рабочых арганізацый і адпаведных органаў дзяржаўнай улады. Яно павінна было займацца наступнымі пытаннямі: рэгуляваць вытворчасць і спажыванне ў краі, арганізоўваць паказальныя сялянскія гаспдаркі, распрацоўку зямельных няўдобіц, нетраў, эксплуатацыю лясных і водных скарбаў, а таксама ўстанаўліваць цвёрдыя цэны на прадукты масавага спажывання, рэгуляваць экспарт і імпарт.

У працоўным заканадаўстве белэсэры лічылі неабходным абмежаваць фізічную працу 42 гадзінамі ў тыдзень, а разумовую – 36 гадзінамі, з бесперапынным 42-гадзінным адпачынкам у тыдзень і месячным – на працягу года; садзейнічаць паляпшэнню ўмоў працы: забараніць звышурочную працу, а таксама працу ноччу (з 8 гадзін вечара да 8 гадзін раніцы), выкарыстанне працы дзяцей да 16 год і абмежаваць працу моладзі (16–18 гадоў) да 6 гадзін у дзень; забяспечыць дзяржаўнае страхаванне ўсіх работнікаў на выпадак іх калецтва, старасці, няздольнасці да працы і беспрацоўя і г.д.[7]

Вясной–летам 1920 г. усходнія і цэнтральныя беларускія землі былі вызвалены ад польскай акупацыі. У гэтых абставінах у другой палове ліпеня кіраўніцтва КП(б)ЛіБ, БПС-Р, БКА[8] і Бунда стварыла спецыяльную камісію з мэтай распрацоўкі ўмоў сумеснай працы па аднаўленню савецкай улады на Беларусі. На яе пасяджэннях сябры БПС-Р (Я.Мамонька, Я.Белькевіч, П.Берднік, М.Пашковіч) выступілі з уласнай праграмай нацыянальнага адраджэння, значнае месца ў якой займалі эканамічныя пытанні.

Зыходзячы з таго, што беларускія землі шмат пацярпелі за гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, белэсэры прапанавалі прыняць рашучыя меры па аднаўленню зруйнаванай прамысловасці і гаспадаркі. Дзеля гэтага

Беларусь павінна стаць самастойнай эканамічнай адзінкай з цэнтрам у Мінску. Прапанавалася, перш за ўсё, устанавіць кантроль і ўлік вывозімай з рэспублікі сыравіны; арганізаваць самастойны, без пасрэднікаў, гандаль з замежнымі дзяржавамі; стварыць спрыяльныя ўмовы для свабоднага, без усялякага нажыму адкуль бы то ні было, развіцця кааперацыі, як сельскагаспадарчай, так і спажывецкай. Эсэры патрабавалі таксама ад дзяржаў, што ваявалі на тэрыторыі краю, абавязковай выплаты кампенсацыі за нанесеныя народнай гаспадарцы страты[9].

Бальшавікі не пагадзіліся з такой пазіцыяй, і 31 ліпеня 1920 г.. БПС-Р адмовілася падпісаць «Дэкларацыю аб незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». З гэтага моманту пачалося жорсткае супрацьстаянне двух палітычных партый. Яно праяўлялася галоўным чынам у пытаннях, звязаных з характарам улады, суверэнітэтам БССР і пашырэннем тэрыторыі рэспублікі да этнаграфічных межаў. БПС-Р энэргічна адстойвала сваё права на легальнае існаванне ў якасці палітычнай апазіцыі.

У сакавіку 1921 г. кардынальным чынам мяняецца эканамічны курс РКП(б). На змену палітыкі «ваеннага камунізму» прыходзіць новая эканамічная палітыка (нэп). Харчовая развёрстка змяняецца харчовым падаткам, уводзіцца свабодны гандаль, адбываецца дэнацыяналізацыя дробных і сярэдніх прамысловых прадпрыемстваў, усталёўваюцца свабода выбару форм гаспадарання, кааперацыя, рыначныя адносіны паміж горадам і вёскай.

Гэтыя крокі савецкай улады не знаходзяць разумення ў лідэраў БПС-Р, для якіх нэп азначаў перш за ўсё спробу рэстаўрацыі капіталізму. «...Бальшавікі сёння будуюць тое, што ўчора самі руйнавалі. Яны адмаўляюцца ад сваёй нацыяналізатарскай дзейнасці і ўстанаўляюць парадкі прыватных капіталістычных адносін, будуюць замест камуністычнай, звычайную буржуазна-капіталістычную, мілітарыстычную, цэнтральна-бюракратычную дзяржаву», – адзначаў Т.Грыб на сходзе Заграпічнай групы БПС-Р[10].

Аналізуючы эканамічную сітуацыю на Беларусі, белэсэры папярэджвалі аб яе катастрафічным стане. Ва ўмовах, калі фабрычна-заводская прамысловасць краю амаль нічога не выраблята, а пакупная здольнасць рубля была занадта нізкай, не магло існаваць сапраўднага тавараабмену паміж горадам і вёскай. Таму, каб забяспечыць магчымасць найбольш хуткага эканамічнага аднаўлення Беларусі, БПС-Р прапаноўвала часова вызваліць край ад харчовых падаткаў.

Акрамя таго, сябры партыі крытыкавалі недахопы нэпаўскай сістэмы падаткаабкладання, а таксама недакладнасць падзелу сялянства на заможных сялян, сярэднякоў і беднякоў[11].

У красавіку 1921 г. лідеры БПС-Р апублікавалі ўласны варыянт Канстытуцыі. Згодна з ім, Беларусь абвяшчалася незалежнай сацыялістычнай рэспублікай, асноўнай мэтай якой прызнавалася ўстанаўленне моцнай дыктатуры працоўнага народа, аб'яднанага ў свабодна выбраныя рады, знішчэнне сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, эксплуатацыі чалавека чалавекам.

Што датычыцца эканамічных патрабаванняў, змешчаных у тэксце Канстытуцыі, то яны не выходзілі за межы праграмы партыі, прынятай у 1920 г.[12] Па-ранейшаму беларускія эсэры выступілі абаронцамі інтарэсаў сялянства. Адстойваючы ў цэлым шырокае развіццё кааперацыі, яны звярнулі ўвагу на неабходнасць захавання самастойнай сялянскай гаспадаркі. Сацыялізацыя зямлі назаўсёды засталася асноўным праграмным патрабаваннем БПС-Р. У апошнія гады свайго існавання партыя эсэраў перажывала палітычны крызіс. Група сяброў на чале з А.Трафімавым і М.Маркевічам пайшла на збліжэнне з КП(б)Б і ўключылася ў нацыянальна-дзяржаўнае і культурнае будаўніцтва ў рэспубліцы. Другая ж частка партыі на чале з такімі лідэрамі, як Т.Грыб, П.Бадунова, Я.Мамонька, застаючыся ў апазіцыі да савецкай улады, вымушана была пакінуць межы БССР. Раскол партыйных радоў у рэшце рэшт прывёў да абвяшчэння самароспуску БПС-Р у чэрвені 1924 г.

Такім чынам, аб'ектыўныя і суб'ектыўныя абставіны не дазволілі беларускім сацыялістам-рэвалюцыянерам выканаць сваю эканамічную праграму і ўсталяваць такі сацыяльна-эканамічны лад на Беларусі, які найбольш адпавядаў бы іх уяўленням аб нацыянальнай дзяржаўнасці.

[1] Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) узнікла ў маі 1918 г. у выніку раскола Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Кіруючае ядро партыі склалі: Т.Грыб, П.Бадунова, Я.Мамонька і інш. Выступала за ўтварэнне незалежнай беларускай дзяржавы ў этнаграфічных межах, устанаўленне дыктатуры працоўнага народа.

[2] Гл.: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (у далейшым НАРБ). Ф.242, воп.1, спр.22, арк.1.

[3] Небарака Антон (Т.Грыб). Прамовы бунтаўшчыка // Грамадзянін. 1919. 18 сакавіка. С.2.

[4] Гл.: Змаганне. 1920. 10 снежня. С.2.

[5] Гл.: Праграмныя дакументы палітычных партый: Вучэбны дапаможнік. Мн., 1994. С.13–14.

[6] Мамонька Я. На ўзломе // Спадчына. 1995. № 4. С.132.

[7] Гл.: Праграмныя дакументы палітычных партый. С.14–15.

[8] Беларуская Камуністычная Арганізацыя (БКА) – арганізацыя камуністычнага кірунку. Дзейнічала з 1 студзеня да жніўня 1920 г. Узначальвалі У.Ігнатоўскі, А.Сташэўскі, І.Каранеўскі.

[9] НАРБ. Ф.325, воп.1, спр.556, арк.91–93.

[10] Грыб Т. Усебеларускі з'езд Саветаў і чарговыя заданні БПС-Р // НАРБ. Ф.325, воп.1, спр.56, арк.144.

[11] Там жа. Арк. 147–151.

[12] Там жа. Арк. 65–69.

*Г.В.ГУСАКОВА*

## ФАКТОРЫ, ОПРЕДЕЛЯЮЩИЕ РАЗВИТИЕ ЭТНИЧЕСКИХ ПРОЦЕССОВ В ШОТЛАНДИИ

Этнические процессы весьма разнообразны и зависят от огромного количества различных условий и факторов. Именно факторы, влияющие на развитие процессов эволюции и формирования этносов, и предполагается рассмотреть в данной работе на примере кельтских народов Великобритании.

На сегодняшний день в Соединенном Королевстве проживают несколько крупных кельтских народов: ирландцы, шотландцы и уэльсцы. Этническая история этих народов довольно интересна: многочисленные контакты и взаимовлияния, долгая борьба кельтов с завоевателями, почти полная ассимиляция и новое возрождение. Здесь можно проследить почти все возможные этапы развития и формирования этноса. К сожалению, в литературе этнической истории этих народов почти не уделено никакого внимания, тем не менее нам представляется интересным изучение этнических процессов внутри кельтских народов Великобритании, в частности Шотландии, и факторов, влияющих на их развитие.

Шотландцы – самый крупный кельтский этнос Великобритании. В сущности, в Шотландии исторически сложилось два народа: сохранившие свой язык хайлендеры западной горной Шотландии и перешедшие на северный диалект английского языка лоулендеры – равнинные шотландцы. Это обусловлено историей развития этих земель, географическим положением и экономикой кельтских народов Шотландии.

Этническую основу современного шотландского этноса составили кельтские народы, переселившиеся сюда из Европы в середине I тысячелетия до н.э. На протяжении многих веков в формировании шотландцев участвовали и другие этносы, что привело к потере многих черт кельтской культуры, кельтского языка. Лоулендеры, равнинные шотландцы, разговаривают на диалекте английского языка, но сохраняют свое национальное самосознание, многие культурные традиции.

Следует отметить и другую часть населения Шотландии – гэлов или, как их называют англичане, хайлендеров. Хайлендеры, т.е. "горцы", до сих пор сохраняют свой язык и многие черты древней кельтской цивилизации, имевшей большое значение для развития всей Европы.

Хотя начало этнической истории у обеих групп было общим, основанным на кельтском происхождении, в ходе исторического развития они были разобщены, отдалены друг от друга и по языку, и по культуре.

Причина подобной ситуации лежит как в сложной географии Шотландии, так и в ее истории. По рельефу Шотландия делится на три области: Шотландское нагорье на северо-западе (Хайленд), Южно-Шотландскую холмистую возвышенность на юге (Лоуленд) и большую долину Мидленд между ними. Высокие, труднопроходимые Грамплианские горы разделяют Хайленд